# ЮБІЛЕЙНЫЯ ДАТЫ

## КУПАЛАВЫ ПРАРОЦТВЫ І БОЛЬ

Што ёсць па сваёй сутнасці прыгожае жыццё чалавека? Ці мае права чалавек абараняць свае мары, спадзяванні, учынкі, калі ўсё гэта большасці здаецца памылковым ці непатрэбным? І як лёс асобнага чалавека яднаецца з лёсам яго Радзімы, з вясёлымі і сумнымі ўздыханнямі яе душы, з трывожным і радасным біццём яе сэрца? І якім жа можа альбо павінен быць шлях чалавека да Радзімы, а беларуса да Беларусі?

Знайсці адказы на падобныя пытанні дапамагаюць таксама і творы Янкі Купалы. Хоць паэт і быў прыхільнікам паганскага светапогляду, усё ж яго маральныя высновы пераклікаюцца з біблейскімі запаветамі аб любові да блізкага свайго, брата свайго, аб дараванні крыўдаў і спадзяванні на дараванне грахоў. Варта прыгадаць радкі з верша "Прыстаў я жыць...", каб упэўніцца ў гэтым: *"<...> І – не зрабіўшы брату злога – // Пад крыжам бацькавым сканаць"* [1].

Жыццё і літаратурная дзейнасць Я. Купалы – гэта грамадзянскі подзвіг чалавека і мастака, беларуса і пісьменніка. Яго творы "Не глядзі", "Мая малітва", "Там", "Сяброўцам па долі", "Прыстаў я жыць...", "Ўвесь да дна...", "Ворагам Беларушчыны", "Памяці С. Палуяна", "Прарок", "Над Нёманам", "На рынку", "Курган", "Бандароўна", "Раскіданае гняздо", "Тутэйшыя" і іншыя абуджаюць у свядомасці чалавека жаданне ўзвысіцца над будзённай шэрасцю, каб, адчуўшы сябе вольнай асобай, нешта змяніць да лепшага ў паўсядзённым жыцці. Я. Купала не проста паэт, не проста грамадзянін сваёй краіны, не проста абаронца заспаных душ свайго народа. Ён – асветнік, філосаф і прарок XX стагоддзя! Асветніцтва Янкі Купалы моцнае сваім маральным зместам. Таму яно неўміручае.

Толькі мастак з чыстым сумленнем здольны выказаць праўду, якую прагнуць пачуць і ўсвядоміць яго суайчыннікі. Такім мастаком быў і наш Янка Купала: паэт трагічнага светапогляду, трагічнага лёсу, трагічнай спадчыны ў яе шляху да чытача. Часам задумваешся, чаму сталася так, што гэты Чалавек з абсалютна чыстым сумленнем, з душою, якой балела за ўсё і ўсіх, столькі гора і няшчасцяў меў у сваім жыцці: няспраўджванне надзей у ранейшай і новай рэчаіснасці, канфлікт з савецкай уладай і спроба самагубства, забарона яго высокамастацкіх твораў у савецкі час і ўсхваленне даволі пасрэдных вершаў, трагічная смерць у Маскве... Творы Янкі Купалы былі прарочыя не толькі для нацыі, народа, суайчыннікаў, але ў некаторай меры і для яго самога. Сведчаннем гэтаму і адказам на пастаўленыя тут пытанні могуць быць радкі з яго верша "На суд": *"Адзін грэх толькі лёг мне на душу, як леў, // Праступак, суддзі, мой: я сэрца, сэрца меў! // Але ці ж гэта так страшэнная віна?!"* [4, с. 11].

Сэрца паэта – гэта і яго сумленне, і душа, і боль, і радасць, і гора, і шчасце. У ім месціцца ўвесь свет з яго прыгажосцю і разладам. А яшчэ – прароцтва, напоўненае болем, узвышанае і з жаданнем змяніць штосьці да лепшага. Чытаеш творы Янкі Купалы – і разумееш, што ты не адзінокі са сваімі думкамі і перажываннямі. Тым болей, што ў наш час неяк не прынята гаварыць уголас пра патрыятычныя пачуцці ці інтымныя перажыванні. А варта было б. Асабліва, калі часам адбываюцца проста непрыстойныя з'явы ў грамадскім жыцці. Думаеш пра гэта – згадваюцца неўміручыя радкі з верша "Там" Я. Купалы: "Там кроў ліецца, там за волю // Барцы на вісельні ідуць, // А вы, вы мучаны найболей, // Спіцё, хоць вас даўно там ждуць". Чытаеш гэты твор Я. Купалы, як і яго "Прарока", –

упэўніваешся, што паэтавы прароцтвы балючыя і нават трагічныя. Складваецца такое ўражанне, што Я. Купала прадказаў іх для беларусаў на ўсе часы.

На вялікі жаль, і цяпер Я. Купала многімі незразуметы. Ён, як той яго Прарок з аднайменнага верша, шмат у якіх выпадках застаецца адзінокім сярод мноства яго сузямельцаў, ды не грамадзян сваёй Бацькаўшчыны. Хвалююча, набатна і прадказальна гучыць гэты верш. Гэта адзін з самых драматычных па змесце твораў паэта. Купалаў Прарок быў адвергнуты суайчыннікамі, якія хацелі атрымаць імгненную выгаду ад яго прароцтваў. Балюча гучаць словы таго "сляпога" народа, кінутыя Прароку: "*Па колькі ж нам дасі чырвонцаў, // Калі мы пойдзем за табой?*" [3, с. 85].

Даследчыкі, здавалася б, даволі поўна ахарактарызавалі і вобразы "Раскіданага гнязда". Аднак, думаецца, мастацкая фактуальнасць гэтага твора патрабуе ўсё ж некаторых сэнсаўтваральных тлумачэнняў. У гэтым плане варта звярнуць увагу на вобразы Данілкі з драмы "Раскіданае гняздо".

Пазнавальныя арыентацыі Данілкі вызначаюцца сваёй "філасофскай" накіраванасцю: яго цікавяць праблемы нараджэння і смерці чалавека, уладкавання свету. У той жа час у адносінах да сямейных праблем ён займае пазіцыю староннягa чалавека: *"пайду адгэтуль на кожны выпадак"*. Данілка чуе і разумее толькі тое, што жадае чуць. У той жа час гэты падлетак жадае знайсці *"жывую ваду"*, каб напіцца самому і пачаставаць ёю сваіх родных, ён марыць адшукаць мёртвую ваду для горкай долі, каб атруціць яе. Дзеля здзяйснення сваіх мар ён імкнецца ў вялікі вольны свет.

Данілка аддае перавагу вольнаму жабраванню перад перспектывай службы ў панскім двары. Ён упэўнены, што жыццё прымусіць схіляцца перад мацнейшым і яго так рашуча настроенага брата. Цікава, што ў выснове (*"Не вытрываеш – пойдзеш!* [да мацнейшых на паклон. – А.М.]" [7, с. 235]), адрасаванай Сымону, утрымліваецца апасродкаваная характарыстыка і яго ўласнай сацыяльнай пазіцыі. У гэтага "дурнавата"-пранікліваго падлетка ўсё пачынаецца з малога: схіленне перад панічом – дзеля выгады, "дурнаватасць" – дзеля лягчэйшага жыцця, блазнаванне – дзеля блазнавання. Данілка блазнуе ў падзеях, якія адназначна трагічныя па сваёй сутнасці: у час майстравання крыжа на бацькаву магілу, у час падрыхтоўкі маці да будучага жабравання. Але асабліва востра такое блазнаванне праяўляецца ў той час, калі брат спачатку даводзіць душу сястры да крайняй мяжы напружання, а потым кажа, што *"наманіў"* пра жаніцьбу паніча. У іншай сітуацыі Данілкавы намеры з'яўляюцца проста жорсткімі і перспектыўна небяспечнымі як сацыяльная пазіцыя творчай асобы. З дапамогай сваёй скрыпкі ён хоча клікаць звар'яцелую Зоську ў жабрачы шлях, найграваючы ёй тую мелодыю, якую *"паніч высвістваў"*. Наўрад ці Данілка задумваўся аб тым, што прынясе ў душу звар'яцелай сястры такая мелодыя.

Самай значнай, дваістай, самай небяспечнай для Данілкі як чалавека і як творчай асобы з'яўляецца яго выснова аб неабходнасці сацыяльнага маўчання з маскай дурнаватасці на твары.

*"Данілка (не слухаючы). Няхай сабе кажуць, што я дурнаваты, што я такі, што я гэтакі, але я ўсё бачу і разумею. Не хачу толькі наверх вылазіць з сваім розумам, бо з ім цяперашнім светам далёка не зойдзеш. Дурнаваты Данілка ці зусім дурны – малы клопат! А толькі што менш яго чапаюць і дрэнчаць, як якога разумнага, то гэта напэўна магу сказаць, бо не ведаюць, чым дасаліць яму, бо Данілка з усяго смяецца. А што ж вы, разумныя? Хоць бы ты, Сымон? Таўпехаецеся, як Марка па пекле ці як мухі ў смале, і больш нічога. Кожны вас шчыпе, кожны вас ашуквае, кожны вас, як-то кажуць, б'е і плакаць не дае. А каб вы былі дурныя, то хоць бы вас і дрэнчылі, але затое не так*

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

*моцна, бо не так бы вас, дурных, баяліся, як баяцца цяпер вас, разумных"* [7, с. 238].

Гэта ўжо разважанні не чатырнаццацігадовага падлетка, а дарослага чалавека. Ягоная свядомасць, калі такія псіхалагічныя ўстаноўкі знойдуць сваё неаднаразовае станоўчае замацаванне, вельмі хутка трансфармуе іх у непахісныя перакананні.

У кантэксце такіх Данілкавых сямейна-сацыяльных арыентацый варта прыгадаць літаратурна-эстэтычную фактуальнасць з наступных Купалавых твораў: вершаў "Паэзія", "Вы кажаце...", "Хоць ты, сэрца, лопні, трэсні...", "Адповедзь", "Я не для вас...", "Не ўздыхай", "Песняру-беларусу", "Жальцеся, грайкія струны", "Памяці С. Палуяна", "Гусляр", "Прарок", "Калі пачнуць...", "Сярод магіл", "Паэта і цэнзар", паэмы "Курган" і інш. Сэнсавая напоўненасць гэтых і іншых твораў супярэчыць вышэй канстатаванай самай галоўнай (!) сямейна-сацыяльнай устаноўцы Данілкі. Такая сацыяльная пільнасць, якая хаваецца за маскай дурнаватасці, наўрад ці дазволіць падлетку ў будучым рэалізаваць яго ўзвышаныя эстэтычныя памкненні.

Калі рэцэпцыйна пашырыць фактуальна-храналагічныя межы драмы "Раскіданае гняздо", правесці паралелі, скажам, з вершам "Разлад", то можна меркаваць, што Данілка ў будучым можа стаць адным з "акаваных львоў", якія "*аслу з напоўненай машною лапы ліжуць*". Калі ж дапусціць, што такія данілкі ўсё ж не на заказ асэнсуюць сутнасць сацыяльных з'яў, то гэтае асэнсаванне не прынясе ім як музыкам сапраўднай эстэтычнай карысці, не паўплывае станоўча на іх музыку. Бо сапраўднае мастацтва не дапускае двурушніцтва. Не змогуць данілкі, калі і будзе ў іх душы нараджацца боль, перадаць яго ў музыцы, бо трэба будзе праўдзіва, балюча граць, а такое ўжо небяспечна. Гэты боль будзе толькі іх ценем, страхамі іх няспраўджаных надзей, жыцця і хворага сумлення. Данілкавы арыентацыі на бяздзейнасць у сацыяльных канфліктах з'яўляюцца для яго той дрыгвой, якая зацягне яго, засмокча ўсяго з галавой, калі такія ўстаноўкі трансфармуюцца ў перакананні, а затым у тып паводзін.

Вобраз Данілкі ў кантэксце твораў Янкі Купалы і адпаведным гістарычным кантэксце набывае рысы своеасаблівага сацыяльнага прадбачання драматурга, становіцца трагічным сімвалам-прадказаннем. У жыццё і мастацтва ўпэўнена ўваходзіць творца-двурушнік, творца-блазан, які ў апісаным Купалам р а з л а д з е (аднайменны верш) зойме адпаведнае яго светапогляду месца. Данілка ўспрымаецца ў кантэксце Купалавых твораў поўным антыподам аўтарскага ідэалу музыкі, паэта, прарока. Яго талент, калі ён ёсць (а ў гэтым даводзіцца сумнявацца), наўрад ці расквітнее: свядомая "дурнаватасць" зацягне яго на пагост. Сэнсавае гучанне вобраза Данілкі пашыраецца ў кантэксце Купалавага верша "Ўвесь да дна...", асабліва ў кантэксце наступных яго радкоў: "Кажуць, кветку стаптала быдляча нага... / Няхай топча, і ты рабі тое; / Сам Антыхрыст не пойме, што нельга, што льга... / Ты не стопчаш – цябе стопчуць ўдвое" [4, с. 15]. Данілкава "кветка" – сумленне, творчыя мары, талент (калі ён ёсць) – будзе "стаптана" ім самім: да гэтага падвядуць Данілку яго сямейна-сацыяльныя ўстаноўкі. Усё пачынаецца з малога: узросту, думкі, учынку.

Купала – паэт трагічнага і ўзвышанага светапогляду. У яго творах асэнсоўваецца спрадвечнае пытанне аб месцы чалавека ў жыцці. А галоўнае тое, што Купалава спадчына ўзрушвае душу глыбінёй аўтарскай думкі і надзвычайнай прыгажосцю яе паэтычнага выкладання. Яна для нас як пасланне, як заклік, як маральны віхор, як малітва, як узвышэнне – усё, аб чым пісаў Янка Купала ў сваім вершы "Сярод магіл": "*Сярод магіл, на плечы ўзняўшы крыж свой, стану, // Як пасланец з магіл ад спячых там пракаў, // І ў даль сягну, дзе толькі можа*"

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

*сягнуць вока, // І скрозь туды, дзе вольнай думкаю дастану. // І кліч пушчу скрозь ад кургану да кургану, // Як віхраў лёт па ўсёй бязмежнасці шырокай, // Кліч заклінанне векавечнага зароку, // Што ў гуслях толькі дрэмле, ў песню ўчараваны* <…>" [4, с. 17].

У розныя часы рознымі былі ацэнкі твораў Купалы савецкага часу: ад выключна пазітыўных (у савецкім літаратуразнаўстве) да негатыўных (у даследаваннях постсавецкага перыяду). Па-рознаму можна адносіцца да хвалебнай лірыкі Купалы трыццатых гадоў (вершы "Сыны", "Вечарынка", "Май", "Кандыдатам народа", "А мы сабе сеем і сеем...", "Дзень добры, Масква!..", "Калыханка", "Аб Сталіне-сейбіту" і інш.). Але варта пры гэтым улічваць не толькі тое, што ляжыць на паверхні гэтых літаратурных тэкстаў, а і тое, што знаходзіцца між радкоў, схавана, што, уступаючы з новым сацыяльным вопытам чытача, адкрывае нам той схаваны сэнс.

Звернемся да некаторых канкрэтных прыкладаў.

"Май" (1937): схаваны сэнс у лексіка-семантычным і вобразна-выяўленчым кантэкстах яго ўтварэння – *Да нас **у госці** май прыходзіць, // А з новым шчасцем кожны год, – // **Заводзіць** песні ў карагодзе, // А ў карагодзе сам народ. // Жалобай думкі аб мінулым // **Замітусяцца** ў нас падчас, – **Наскочыць** радасць **гудам-гулам**, // І май наш повен ясных крас. // Гармонік **ража**, бубен **б'е**... // Гэй, грай, музыка, ў родны* [чытай роўны (аднолькавы). – А.М.] *тон // І аб мінулай барацьбе, І аб **здабытках** нашых дзён!*[1] <…> *Як не спяваць тут, як не жыць // У казках-былях нашых дзён!..* [5, с. 102]. Іншыя прыклады з "Мая". Верш 50-ты – у лексемах *байцы, патрулі* ("*байцы не дрэмлюць поўны гарту, // На крыллях нашы патрулі*") чытаецца іншы (у параўнанні са знешне відавочным) сэнс: гэтыя "абаронцы" – чужакі паводле іх мэт, не *змагары* (як гэта было б лагічным паводле сэнсаўтваральнай традыцыі беларускай мовы), а патрулі (актуальная лексема савецкага часу). Але ў 60-м вершы аўтар сцвярджае: *Свабодных не скаваць людзей! Да нас прыходзіць май у госці // І ўспамінае*[2] *ў свята свят // **Герояў**, што зляжылі косці // **У бітвах** за савецкі лад*[3]. // <…> *Шасцяць чырвоныя сцягі, // Унуку дзед свайму гавора, // Хто у магіле спіць такі. // Бы срэбрам выснутую ніць, // Унуку думкі дзед снуе. // **Як** трэба волю бараніць. // **Як** уміралі за яе.* У гэтым вершы асабліва відавочная наступная асаблівасць сэнсаўтварэння: паэтычная лексіка неадназначная (як мінімум двухзначная), мае ўласцівасці да ўзаемазамянняльнасці паводле кантэкстуальнай семантыкі, яна мае здольнасць сэнсавага ўзаемавыключэння, рознай сэнсавай праекцыі і збіральнасці.

"Кандыдатам народа" (1938): схаваны сэнс у лексіка-семантычным і вобразна-выяўленчым кантэкстах яго ўтварэння – *Хто з нас думаў, спадзяваўся, // Мой ты **родны** браце. // Што **такіх** мы кандыдатаў // Будзем выбіраці.* <…> *Людзі ходзяць урачыста // У святочных строях*[4], <…> *// Людзі ходзяць, **весяляцца**, // **У** думках іхніх свята. // **А** на вуснах іх імёны // **Слаўных** кандыдатаў*[5] [5, с. 128].

"А мы сабе сеем і сеем..." (1938): схаваны іранічны сэнс у вобразна-выяўленчым кантэксце яго ўтварэння – *Стаіць наш страж на граніцах, – // Вартуе*

---

[1] Працытаваная страфа паўтараецца і ў фінале верша, што таксама выконвае значную сэнсаўтваральную функцыю.

[2] Не забываецца пра "небяспеку" для савецкага ладу.

[3] У бітве два бакі: абаронцы "мая" і яго "апаненты", апошнія – гэта тыя, каго знішчыў *май*, (і ў савецкі час таксама), але і пра знішчаных ён памятае, бо памяць пра іх у свядомай частцы народа небяспечная, яна пабуджае да нязгоды, да сапраўднай барацьбы за сапраўдную волю, аб гэтым пульсуе думка ў наступных радках 60-га і 70-га вершаў.

[4] Урачыстыя толькі ў святочных – бальшавіцкіх – строях.

[5] Сапраўднае ж свята толькі ў думках, агучваць якія небяспечна, бо на вуснах зараз павінны быць імёны "*слаўных*".

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

*ад чорнай напасці // І нашы загоны з пшаніцай, // І наша вялікае шчасце.* <...> *// З усмешкай мы жыццю глядзім у вочы, – // Судзіла доля шчасце на вяку, – // Збіраем кветкі папараці ўночы. // Днём з ясным сонцам ходзім пад руку* [5, с.139-140]. Навошта збіраць кветкі папараці, калі ўжо ёсць “вялікае шчасце”? Тут утрымліваецца ўзаемавыключальны сэнс.

На названыя вышэй і іншыя вершы можна спраецыраваць прынцып лексічнай і сінтаксічнай узаемазамяняльнасці (у такім выпадку не парушаецца рытм і рыфма; напрыклад, “Аб Сталіне-сейбіту”, “Калыханка”), супастаўленне таго, што ўсхваляецца, з тым, што было сапраўды ў прататыпнай рэчаіснасці (“Табе, правадыр”, “Май”), пастаноўку лагічных націскаў на лексемы, якія па-за кантэкстам семантычна нейтральныя, могуць мець антанімічны сэнс (“Кандыдатам народа”, “Май”, “Дзень добры, Масква!..”) – усё гэта спрыяе выяўленню схаванага ў творы сарказму, які разгортваецца на фоне стылізаванай пад масавае мысленне патэтыкі. У дадзеным выпадку падобныя вершы нібы разлічаны на супастаўленне таго, што паказана, з тым, што ёсць, дзеля выяўлення істотнага, сутнаснага ў іх: сарказму, стылёвага і сэнсавага здзекавання (тут можна выкарыстаць вельмі трапны выраз “літаратурны сцёб”). У сувязі з гэтым варта прыгадаць, што для лірыкі Купалы дакастрычніцкага часу была ўласціва іронія (рамантычная іронія ў вершах “Разлад”, “Увесь да дна...” і інш.). Іронія, сарказм, толькі ў іншых форма- і сэнсаўтваральных кантэкстах праяўляюцца і ў вершах 1930-х гг.

Гістарычная рухомасць дазваляе выяўляць і іншыя асаблівасці сэнсаўтварэння ў лірыцы Купалы савецкага часу: напрыклад, асаблівасці савецкай міфатворчасці. Але адно не пярэчыць другому. Выкарыстанне Купалам, напрыклад, біблейскай сімволікі – гэта *яшчэ* адзін спосаб адлюстравання стылю і форм мыслення рэвалюцыйнай эпохі, калі дзеля дасягнення мэты былі прыдатнымі ўсе сродкі.

Пры ацэнцы лірыкі Купалы савецкага часу варта мець на ўвазе і той факт, што ў 1930 г. паэт, не вытрымаўшы здзекаў з боку следчых органаў, спрабаваў развітацца з жыццём шляхам самазабойства. Супастаўленне фактаў жыцця Купалы 30-х гг. дазваляе зрабіць гіпатэтычную выснову: паэту такое існаванне ў таталітарнай сістэме было недарагім. І ў гэткіх умовах, калі шырока можна было звяртацца да народа толькі ў прымальных для афіцыйнага палітычнага кантролю формах, Купала выкарыстоўвае такія формы дзеля данясення хай сабе і завуаляванай, але праўды, праз намёк, але сапраўднай характарыстыкі існуючага ладу і яго праяў. Нягледзячы на вонкава падкрэсленую хвалебнасць адпаведных вершаў 30-х гг., у іх праяўляецца стылізацыя пад замбіраванае масавае мысленне таго часу. І ў той жа час талент Паэта заставаўся падпарадкаваны толькі вышэйшым законам светаўладкавання. Тут можна прыгадаць сцверджанне Гусляра з паэмы “Курган”, адрасаванае князю, які загадаў праспяваць жаданую яго сэрцу песню: “*Небу справу здае сэрца, думка мая, // Сонцу, зорам, арлам толькі роўна*” [6, с. 56].

“Адданасць” Купалы “шчаслівым” праявам савецкай рэчаіснасці ў хвалебнай лірыцы была двайной паводле рэцыпцыйнага вектара: для “*сейбітаў*” новага жыцця – адданасць літаратурна-стратэгічная і для пранíклівага сучасніка (а можа, найболей для ўдумлівага нашчадка) – адданасць праўдзе жыцця.

Купала – пісьменнік надзвычай канцэпцыйнага плана. Бадай, ні адна з яго эстэтычных і грамадзянскіх ідэй, акрэсленых у ранейшых па часе напісання творах, не была пакінута без новай сэнсавай падсветкі ў пазнейшых творах. І ў гэтым – не паўтарэнне, а мастацкае ўдакладненне, паглыбленне дзеля пацвярджэння шматграннасці і шматсэнсоўнасці адных і тых жа праяў свету. Наўрад ці можна даць поўную характарыстыку асобнага Купалавага вобраза, узятага па-за кан-

тэкстам іншых твораў Майстра. У гэтым плане творчасць Янкі Купалы – гэта літаратурны аб'ёмны жывапіс. Кожны асобны твор з усімі яго састаўнымі часткамі ўяўляе сабой толькі фрагмент складанай карціны свету. У далучанасці ж аднаго да другога, у гарманічным сэнсавым яднанні і ўзаемадапаўненні альбо нават у знешняй неспалучальнасці ў межах нейкіх блізкіх частак гэтыя фрагменты пры ўмове сфакусаванага іх успрыняцця ўтвараюць надзвычай аб'ёмную і шматмерную карціну свету.

Спадчына Купалы – гэта вялізны духоўны курган для нашага народа, поўны таямніц, загадак, у якім адначасова знаходзяцца разгадкі да гэтых таямніц і новыя таемныя праявы быцця. Разгадаем іх – можа, зробім яшчэ адзін значны крок наперад да сапраўднай светлай будучыні нацыі. І як тут не прыгадаць заключныя радкі з неўміручага Купалавага "Кургана"?!

"<…> *Кажуць людзі: ў год раз ночкай з гуслямі дзед // З кургана, як снег, белы выходзе. // Гуслі строіць свае, струны звонка звіняць. // Жменяй водзіць па іх абамлелай, // І ўсё нешта пяе, што жывым не паняць, // І на месяц глядзіць, як сам белы. // Кажуць, каб хто калі зразумеў голас той, // Не зазнаў бы ніколі ўжо гора… // Можна тут веры даць, толькі слухаць душой… // Курганы шмат чаго нам гавораць"* [6, с. 58].

*ЛІТАРАТУРА*

1. ***Купала, Я.*** Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літаратура, 1997. – Т. 3. – С. 69 (далей спасылкі на гэтае выданне даюцца непасрэдна ў тэксце з пазначэннем у дужках нумара тома і старонкі з яго).

Д-р філал. навук
*А.М. МАКАРЭВІЧ*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова